В. П. Рагойша

# Вяршыня беларускага паэтычнага трыглава

*Друкуецца па матэрыялах каталога «Аўтографы першага народнага паэта Беларусі Янкі Купалы» са згоды Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



У кожнага народа сярод класікаў нацыянальнага пісьменства вылучаюцца постаці найгалоўныя, якія ўнеслі асаблівы ўклад у развіццё роднай літаратуры, мовы і культуры, сталі своеасаблівымі сімваламі народа. У англічан гэта Уільям Шэкспір, у рускіх — Аляксандр Пушкін, у палякаў — Адам Міцкевіч, украінцаў — Тарас Шаўчэнка... У беларусаў такой постаццю з'яўляецца Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч; 7 ліпеня 1882 г. — 28 чэрвеня 1942 г.).

Зразумела, Янка Купала не зрабіў бы для літаратуры, культуры, беларускага народа ўсяго таго, што ён здзейсніў за свае шэсцьдзясят гадоў, каб не было побач з ім яго паплечнікаў, аднадумцаўпадзвіжнікаў. Калісьці выдатны ўкраінскі паэт Паўло Тычына вобразна назваў Купалу «першай вяршыняй беларускага Эльбруса паэзіі». Эльбрус — гара на Каўказе, у якой дзве вяршыні, прычым адна крыху вышэйшая за другую. Другая вяршыня, паводле Тычыны, — яшчэ адзін волат беларускага слова — Якуб Колас. Сёння ж становіцца аксіёмай: самая высокая «гара» беларускага паэтычнага горнага хрыбта XX ст. не дзвюхвяршынная, а трохвяршынная, што нагадвае славацкі Трыглаў. Разам з вяршынямі Янкі Купалы і Якуба Коласа ў наш літаратурны Трыглаў арганічна ўпісваецца і вяршыня Максіма Багдановіча.

У канцы жыццёвага шляху ў вершы «Я памятник себе воздвиг нерукотворный...» (1836) А. Пушкін так выказаў асноўны пафас сваёй творчасці:

*И долго буду тем любезен я народу,*
*Что чувства добрые я лирой пробуждал,*
*Что в мой жестокий век*
*восславил я свободу*
*И милость к падшим призывал.*

У гэтых словах — асноўнае творчае крэда Пушкіна, у якім арганічна з'ядналіся яго ідэалы — маральна-этычны і сацыяльна-палітычны. Толькі волату пад сілу эстэтычна аб'яднаць у сваёй творчасці адно і другое, не дапускаючы перакосу ў той ці іншы бок. Прычым, выявіць усё з такой мастацкай сілай, на якую здольны толькі вялікі талент. Беларуская зямля пасля Францыска Скарыны роўна пяць стагоддзяў чакала з'яўлення такога літаратурнага генія. Ім стаў Янка Купала.

У 1926 г., падводзячы вынік сваёй 20-гадовай літаратурнай дзейнасці, Янка Купала ў вершы «За ўсё» пісаў:

*Я адплаціў народу,*
*Чым моц мая магла:*
*Зваў з путаў на свабоду,*
*Зваў з цемры да святла.*

*Для Бацькаўшчыны беднай,*
*Для ўпаўшых яе сіл*
*Складаў я гімн пабедны*
*Сярод крыжоў, магіл.*

*Змагаўшыся з напасцяй*
*За шчасце для людзей,*
*Не раз пісаў ў няшчасці*
*Крывёй сваіх грудзей.*

*Уносіў гэтым долю*
*Сваю для ўсіх дабра.*
*А болей... Што ж там болей*
*Жадаць ад песняра?!*

Няўжо не чуцён у гэтых словах водгалас боскай пушкінскай ліры? І не ў сэнсе перайманне, паўтарэння, эпігонства, а — узнясення да Пушкіна, на вышыні дабра, гуманізму, свабоды? Як і Пушкін, які ў «жестокий век» змог уславіць свабоду, гэтак і Янка Купала актыўна заклікаў родны народ вырвацца «з путаў на свабоду». А хіба не адчуваюцца ў словах Купалы пра тое, што «сярод крыжоў, магіл» ён «уносіў... долю сваю для ўсіх дабра», маральна-этычныя прынцыпы, якімі кіраваўся і Пушкін («чувства добрые я лирой пробуждал», «милость к падшим призывал»)? Патрыятычныя пачуцці ў абодвух паэтаў таксама былі падобныя. І ў гэтым — яшчэ адно выяўленне агульначалавечай, гуманістычнай сутнасці глыбока нацыянальнай паэзіі як Пушкіна, так і Купалы. Праўда, Пушкіну не трэба было складаць «гімн пабедны» Бацькаўшчыне, тым больш «сярод крыжоў, магіл»: яго Расія як самастойная дзяржава даўно ўжо існавала, і ёй нішто не пагражала. У адрозненне ад Купалавай Беларусі, дзяржаўнасць якой патрэбна было яшчэ ўсталёўваць. Ды што там дзяржаўнасць! Патрэбна было адстойваць правы на існаванне роднага народа, беларускай мовы, культуры...

З путаў на свабоду, з цемры да святла... Гэткі шлях разам з беларускім народам прайшоў і сам паэт. Янка Купала, несумненна, быў мастацкім летапісцам жыцця народа. Але не толькі. У розны час, у залежнасці ад абставін, тонкі і шчыры лірык станавіўся то паэтам-грамадзянінам, то прарокам, то філосафам, а то і воінам «за долю, волю і народ» («Памяці С. Палуяна»). Яго творчасць выяўляла рост сацыяльна-палітычнай і нацыянальнай свядомасці беларусаў, але і актыўна садзейнічала гэтаму росту, фарміравала грамадскі ідэал, нацыянальную самасвядомасць, абуджала гістарычную памяць — стала сцягам духоўнага адраджэння народу.

Калі ахапіць думкаю XX ст. у дачыненні да лёсу беларускага этнасу, то пры ўсёй драматычнасці і нават трагічнасці асобных перыядаў жыцця народа (Першая сусветная вайна, грамадзянская і савецка-польская войны, палітычны генацыд 1930-х і пазнейшых гадоў, Другая сусветная вайна і інш.) можна ўбачыць галоўнае, чаго мы дасягнулі: мы нарэшце сталі нацыяй. І хоць па сённяшні дзень надзвычай актуальная задача — з так званых пашпартных беларусаў «ствараць» беларусаў свядомых, сапраўдных патрыётаў незалежнай Рэспублікі Беларусь, усё ж на пытанне «А хто там ідзе?» сучасная наша «грамада», думаецца, упэўнена адказала б пакупалаўску: «беларусы». І заслуга, несумненна, перш за ўсё Янкі Купалы, які на працягу трох з паловай дзесяцігоддзяў XX ст. (самых, бадай, цяжкіх і адказных), абапіраючыся на зробленае папярэднікамі і на сваіх аднадумцаў-сучаснікаў, нястомна і настойліва ствараў нацыю: фарміраваў яе самабытны духоўны воблік, ажыўляў гістарычную памяць, пашыраў нацыянальную самасвядомасць, узбагачаў беларускую літаратурную мову, надзяляў беларусаў мастацкімі скарбамі сусветнага ўзроўню, вызначаў іх духоўныя арыенціры... Прычым гэтае тварэнне нацыі адбывалася паступова, паэтапна, у залежнасці ад канкрэтна-гістарычных абставін. Тое, што абсалютная большасць насельніцтва былога «Северо-Западного края» Расійскай імперыі з так званых «польскіх», «рускіх» ці проста «тутэйшых» яго насельнікаў паступова стала беларусамі, усвядоміла сябе як народ, такі ж самы, як астатнія славяне, тое, што беларусы захацелі заняць (і ўрэшце занялі!) «свой пачэсны пасад між народамі» («Маладая Беларусь») — атрымалі дзяржаўнасць, а ў канцы XX ст. і дзяржаўную незалежнасць, — ва ўсім гэтым агромністая, не да канца яшчэ намі ацэненая заслуга Янкі Купалы. Сам горача паверыўшы ў ідэю нацыянальнага адраджэння роднага народа, паэт запальваў ёй іншых. Бацька нацыі — у такім найменні-перыфразе Янкі Купалы няма перабольшвання.

З кожным годам усё большы прамежак часу аддзяляе нас ад тых дзён, калі жыў і тварыў Янка Купала. За марывам гадоў падчас цяжка ўбачыць вострую актуальнасць, надзённасць, тую ці іншую падзейную абумоўленасць асобных яго твораў. Аднак часавая адлегласць разам з тым дазваляе разгледзець многае з таго, што зблізку і не так заўважыш, паколькі, як вядома, «большое видится на расстоянии» (С. Ясенін). Так, сёння выразней, чым калі бачыцца агульначалавечая сутнасць творчасці народнага паэта Беларусі. Надзвычай глыбока паглядзеўшы на спачатку прыгнечанага, а потым сацыяльна і нацыянальна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разняволенага селяніна-беларуса, ён тым самым стварыў аптымістычную кардыяграму «ачалавечвання» чалавека-працаўніка. Такая кардыяграма набывае асаблівае значэнне ў кантэксце сацыяльнай і нацыянальнавызваленчай барацьбы, змагання за дэмакратызацыю грамадскага ладу, якія вядуцца ў многіх месцах нашай планеты.

Янка Купала — выдатнейшы майстар паэтычнага слова, адзін з самых буйных паэтаў, якіх увогуле ведае гісторыя сусветнай літаратуры. Калісьці М. Рыльскі пісаў: «Янка Купала быў невычэрпна разнастайны ў вершаванай форме, у яго мы бачым і творы, складзеныя зусім у духу народных песень («Алеся» яго, са змененым імем «Ганнуся», — запісана ва Украіне з народных вуснаў як фальклорны твор), і складаныя страфічныя формы, і зварот да такіх кананічных узораў, як актава, — але скрозь — ён той самы Янка Купала: просты, шчыры, крыштальна-ясны, сапраўды народны паэт». Трэба ўлічыць, што Янка Купала не проста абжываў для беларускай паэзіі некаторыя, невядомыя ёй раней, формы верша (напрыклад, санет, брахікалан і інш.), але і свядома ствараў новыя. Паэт узняў культуру беларускага верша на сусветную вышыню, як ніхто з беларускіх паэтаў пасадзейнічаў развіццю тэхнікі вершавання, прыўнёс у беларускае і ўсё славянскае вершаскладанне свае рытмы, інтанацыі, накрэсліў найбольш перспектыўныя шляхі, якімі зараз развіваецца беларускі верш. Паэзія Янкі Купалы з'яўляецца сапраўднай школай майстэрства для ўсіх сучасных і наступных пакаленняў беларускіх пісьменнікаў.

Янка Купала — непераўзыдзены майстар беларускага слова. Аўтар «Жалейкі», як слушна заўважыў А. Луначарскі, прыўнёс у літаратуру «свой слоўнік, свае звароты, сваю паэтычную музыку проста з сялянскіх глыбінь, з цалін народнай моватворчасці». У той час, калі Якуб Колас, чэрпаючы з тых самых крыніц, усё ж свядома ці падсвядома кантраляваў асноўныя лексічныя і марфалагічныя нормы сваёй мовы (настаўніцкая адукацыі не магла не выявіцца і ў гэтым!), калі Максім Багдановіч, жывучы далёка ад Беларусі, карыстаўся пераважна кніжнай, вывучанай беларускай мовай, моўная стыхія Янкі Купалы — сінтаксічна гнуткае, лексічна багатае, інтанацыйна выразнае жывое народнае маўленне, якое часта не ўкладваецца ў пракрустава ложа сучаснай граматыкі. Янка Купала — яскравы прыклад сапраўды народнага паэта, які ўваскрашае ў памяці псіхалагічны тып старажытнага сказіцеля-баяна. І прыклад тым больш знамянальны, што жыў такі баян не ў легендарныя часы «Слова пра паход Ігаравы», а ў XX ст., у касмічны век.

Мы — сведкі таго, як паэтычнае слова Янкі Купалы жывіць не толькі беларускую, але і іншыя літаратуры, найперш суседнія славянскія, у тым ліку такую багатую, як руская. Крынічная, светлая творчасць паэта неаднойчы асвяжала голас Аляксандра Твардоўскага, Міхаіла Ісакоўскага, Сяргея Гарадзецкага, у чым прызнаваліся самі майстры вершаванага слова. Для Аляксандра Пракоф'ева, напрыклад (дарэчы, як і для Усевалада Раждзественскага, Міхаіла Галоднага, Марыі Камісаравай і некаторых іншых вядомых рускіх паэтаў), творчасць Янкі Купалы з'явілася той «пераправай», якая надзейна і назаўжды злучыла іх з вечназялёным мацерыком беларускай паэзіі. Дзякуючы гэтай сувязі ўсе паэты-перакладчыкі адчулі на сабе дабратворны ўплыў Купалавай музы. Здзейснілася іх запаветнае жаданне — каб і на іх паэзію «упало хотя б немного света из того сиянья слов, в котором рос Купала, с которым Колас ведал торжество» (А. Пракоф'еў).

Творчасць беларускага паэта дазваляе часам глыбей зразумець некаторыя працэсы ў гісторыі іншых нацыянальных літаратур. У прыватнасці, яна ў пэўнай ступені запаўняе лакуну ў рускай паэзіі 1900-х гг. Як слушна заўважыла рускі літаратуразнавец Р. І. Файнберг, «у рускай літаратуры той пары не было паэта, які, працягваючы справу Някрасава, раскрыў бы знутры свет устрывожанага рэвалюцыяй чалавека. Такая задача выпала на долю вялікага лірыка, які выступіў у 1905 г. ад імя заняволенага сялянства Беларусі»...

Творчасць Янкі Купалы — нібыта шырока расчыненае акно ў свет усёй беларускай паэзіі першай паловы XX ст. Адсюль, з акна Купалавай паэзіі, лепш бачацца не толькі тыя магістральныя шляхі, па якіх ішла беларуская літаратура, а нават узбочныя сцежкі і дарожкі. Відаць выразна і тое, што гэтыя шляхі тварыў ніхто іншы, як Янка Купала разам з Якубам Коласам. І як бы ў свой час ні станавіліся «ў рожкі са старымі» некаторыя з маладых беларускіх літаратараў — сучаснікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, сёння іх вершы і паэмы свецяцца прывабным святлом паэтычнасці ў вялікай ступені дзякуючы суседству з выдатнымі творамі класікаў. Гэтак пачынае свяціцца люмінісцэнтная лямпа, калі побач з'яўляецца магутная крыніца электроннага выпраменьвання...

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ